Брыянтэ МЕНДОСА:

# «Чалавек не маральны і не амаральны, чалавек — і ёсць мараль»

**Разабрацца ў паняцці «мастацтва кіно» — тое ж самае, што знайсці сэнс жыцця. Але ж калі пошукі сэнсу жыцця ніколі не спыняліся, то і спробы зразумець, у чым заключаецца сутнасць мастацтва кіно і яго адрозненне ад кінапрадукту, маюць права на існаванне.**

**У гэтых пошуках да нас далучаюцца людзі са свету кінематографа. Яны раскажуць пра сваю працу, сваё бачанне кіно, пра метафізічнае і рэальнае, пра сусветнае і вузкасацыяльнае, пра важнае і банальна простае. І таксама, як пасля добрага кіно мы становімся іншымі людзьмі, магчыма, гэтыя інтэрв'ю дапамогуць нам аддаліцца ад нязручных сацыяльных умоўнасцяў.**

**Філіпінец Брыянтэ Мендоса, можна сказаць, стаў рэжысёрам выпадкова. Калі яму было 44 гады, на прапанову стварыць фільм ён падумаў «Чаму б і не?». І з тых часоў здымае прыкладна па дзве карціны ў год. У выніку са сваімі працамі Мендоса стаў частым госцем на Канскім кінафестывалі, дзе ў 2009 годзе за фільм «Бойня» атрымаў узнагароду як найлепшы рэжысёр, а ў 2015-м за карціну «Пастка» — прыз экуменічнага журы. На пазамінулым Мінскім кінафоруме «Лістапад» Брыянтэ Мендоса прадстаўляў сваю карціну «Чэрава тваё» пра бясплодную жанчыну з племені Таві-Таві, што для свайго мужа шукае жонку, здольную нарадзіць дзіця.**



Рэжысёра называюць ультранеарэалістам. І сапраўды, на рэалістычнасць ён робіць стаўку, часта выкарыстоўваючы элементы дакументалістыкі. Напрыклад, у карціне «Чэрава тваё» былі зняты сапраўдныя роды. Яго фільмы — у першую чаргу пра чалавека, яго ўстаноўка — адлюстроўваць на экране навакольную рэальнасць. Так Мендоса пераняў для сябе прынцып «Found story», гэта значыць прынцып знойдзенай гісторыі, які прадугледжвае наяўнасць рэальнага чалавека з рэальнымі перажываннямі, праз якія рэжысёр пачынае пазнаваць праблему.

**«Падчас здымак у мяне ніколі не бывае дакладных установак, мы робім шмат спантанных рэчаў, імправізуем, таму да мантажу прыходзім з нявызначанасцю і хваляваннем».**

Мендоса выпрацаваў свае метады працы над рэалістычнасцю, у якіх галоўныя ролі выконваюць камера, гук і акцёры. Камера заўсёды ў руху і пазбягае статычнасці, часам сваёй «неспакойнасцю» яна адлюстроўвае атмасферу саміх падзей, яна сочыць, менавіта сочыць за чалавекам ці ўвогуле быццам адсутнічае, настолькі арганічна незаўважным здаецца гэта назіранне. Рэжысёр гаворыць, што шумы на Філіпінах асаблівыя ў параўнанні з іншымі месцамі, таму мікрафоны запісваюць гукі наваколля, да якіх можна прыслухацца падчас прагляду фільмаў. А акцёры, як прафесійныя, так і непрафесійныя, працуюць на здымачнай пляцоўцы без дакладнага сцэнарыя — менавіта пражываюць іншае жыццё перад камерай. Нягледзячы на такі прынцып працы, аўтар кажа, што не робіць шмат дубляў, бо акцёры, што ўжыліся ў роль, думаюць і адчуваюць сябе так жа, як тыя, каго яны іграюць. Таму няправільных слоў ці жэстаў быць не можа. Франсуа Труфо і братоў Дардэн Мендоса называе любімымі рэжысёрамі, што цалкам лагічна з іх агульнай любоўю і ўвагай да звычайнага чалавека.

Карціна аўтара «Пастка», што паказвалася ў рамках майстар-класа на сёлетнім кінафестывалі «Лістапад» (гэта быў другі візіт Брыянтэ на Мінскі кінафорум, і магчымасць трэцяга рэжысёр не выключае), стваралася з бескарыслівай дапамогай вялікай колькасці жыхароў філіпінскага горада Таклабан, што пацярпеў ад аднаго з самых моцных тайфунаў у гісторыі метэаназіранняў. Можна толькі выказаць здагадку аб тым, наколькі гэта важны праект для саміх філіпінцаў, бо фільм прама і шчыра распавядае пра боль тых, хто страціў дзяцей, бацькоў ці сужэнца. Але ёсць у Брыянтэ Мендосы карціны, не звязаныя відавочна з перажываннямі вялікай колькасці суайчыннікаў. Напрыклад, неадназначны фільм «Сербіс» пра порнакінатэатр ці тая ж «Бойня», за якую аўтар атрымаў узнагароду Канскага кінафестывалю. Я запыталася ў Брыянтэ, як гэтыя і іншыя карціны былі ўспрыняты на радзіме.

— Я магу сказаць, што філіпінцы ўспрынялі мае карціны, але не магу сказаць, што ўспрыняў іх масавы глядач. У краіне ведаюць мяне і мае работы, прызнаюць як рэжысёра з сусветным імем, але тут усё яшчэ больш папулярныя рамантычныя камедыі, галівудскія блокбастары і філіпінскі мэйнстрым. Нават мая апошняя работа «Пастка» насамрэч не так шыракавядомая і папулярная, якой магла б быць.

**«Каб ствараць фільм, трэба выпрацаваць, акрамя эстэтыкі і ўсяго, што тычыцца візуальнага рада, уласнае стаўленне да знойдзенай гісторыі».**

***— Гэта традыцыйныя суадносіны паміж масавым і аўтарскім кіно. Вы неяк казалі, што рэалістычнасці ў кіно дасягнуць даволі складана. Стварэнне новай рэальнасці перад камерай — апрыёры працаёмкі працэс. А ў чым складанасць з рэалістычнасцю?***

— Мае фільмы расказваюць пра рэальныя падзеі, што мы знаходзім і па якіх праводзім даследаванне, якія падрабязна разбіраем і потым на аснове гэтай працы пішам сцэнарый. Прынцып знойдзенай гісторыі вельмі складана сумясціць з тым, як распавядаецца гэта гісторыя, з тым, як пішацца гук, як складваецца карцінка і гэтак далей — складана сумясціць рэалістычную гісторыю з кінематаграфічнымі метадамі апавядання.

***— Раскажыце як кіраўнік працэсу, як павінен працаваць аператар, якія ўстаноўкі прымаюць акцёры, чым насычаецца матэрыяльнае асяроддзе, якімі якасцямі надзяляюцца персанажы, каб дасягнуць гэтай рэалістычнасці?***



Кадр з фільма «Чэрава тваё».

— Каб ствараць фільм, трэба, акрамя эстэтыкі і ўсяго, што тычыцца візуальнага рада, ужо ў працэсе даследавання выпрацаваць уласнае стаўленне да знойдзенай гісторыі, што дапаможа самому працэсу і знаходжанню вялікага аб'ёму матэрыяла. Думаю, далёка не ўсе рэжысёры ад моманту знаёмства з ідэяй да пачатку здымак выпрацоўваюць свае адносіны і праводзяць даследаванне. Напрыклад, я рэзка негатыўна стаўлюся да любой несправядлівасці, ці то ў адрас жанчыны, ці то ў адрас старога чалавека, і рэагую на гэта — у цэнтры фільма павінна быць праблема, якая будзе мяне асабіста глыбока хваляваць. Самы складаны этап пачынаецца, калі трэба сумясціць гісторыю з даследаваннем, а ўсё гэта, у сваю чаргу, суаднесці з маім стаўленнем да сюжэта. Па вялікім рахунку, сцэнарый для фільма з'яўляецца Бібліяй, таму гэты этап ёсць напісанне Бібліі. Ва ўмоўную скрынку я складваю гісторыю, даследаванне, веды, адносіны, сілы, эмоцыі, каб склаўся сцэнарый. Калі пачынаецца камандная праца, мне важна, каб хаця б 50% са складу групы адчувалі ў дачыненні да гісторыі тое ж, што адчуваю я, каб мы працавалі практычна як сям'я. А працэс здымак — самы просты этап: ты як у школе пасля доўгай вучобы і выканання дамашняй работы толькі прымяняеш тое, што некалі вывучыў, на практыцы і здаеш экзамен. З экзаменам, які можа доўжыцца гадзіну ці менш, ты лёгка спраўляешся пры ўмове, што добра працуеш год да яго. Яшчэ адзін складаны этап — мантаж, падчас якога трэба з усяго адзнятага матэрыялу зрабіць фільм. У гэты момант усё залежыць ад таго, як ты адказваў на экзамене. Тут для мяне і здараецца сапраўдная магія: падчас здымак у мяне ніколі не бывае дакладных установак, мы робім шмат спантаных рэчаў, імправізуем, таму да мантажу прыходзім з нявызначанасцю і хваляваннем. З адзнятага матэрыялу ствараецца гісторыя, і мы самі не ведаем, ці будзе яна такой, якой мы яе ўяўлялі.

***— Вы здымаеце ў сярэднім два фільмы штогод. Гэта насамрэч вельмі прадуктыўна, у чым сакрэт?***

— Мне вельмі падабаецца мой занятак, я нават не магу назваць яго працай.

***— Вашы фільмы аб простых людзях, іх праблемах, жыцці. Нейкім чынам сваімі карцінамі вы рэагуеце на несправядлівасць, на хібы навакольнага свету. Гэтая праца-задавальненне робіцца ў першую чаргу для сябе ці для іншых?***

— Я атрымліваю задавальненне ад сваёй працы, але, вядома ж, не атрымліваю задавальнення ад таго, што людзі пакутуюць. Гэта мой абавязак як мастака — паказваць тое, што я бачу, таму што ў мяне ёсць для гэтага магчымасці і сілы. Галоўная мэта для мяне — дамагчыся сваімі карцінамі пэўных змен. Я разумею, што гэта далёкая і складаная перспектыва, але вельмі хацелася б, каб нашы фільмы некалі нешта змянілі.

**Мендоса пераняў для сябе прынцып «Found story», гэта значыць прынцып знойдзенай гісторыі, які прадугледжвае наяўнасць рэальнага чалавека і яго рэальных перажыванняў.**

***— Што дакладна вы маеце на ўвазе?***

— Праблем заўсёды шмат, яны былі і будуць. Зразумела, што мы не зможам вырашыць іх усе, але я раблю свой крок (і заўсёды буду яго рабіць) дзеля таго, каб калі-небудзь прыйсці да гарманічнага грамадства, у якім камфортна знаходзіцца і жыць.

***— Ёсць такая кінематаграфічная формула, якая кажа, што прысутнасць Бога ў фільмах Дрэера ўказвае на яго прысутнасць, адсутнасць Бога ў Бунюэля — на яго адсутнасць, у Феліні — прысутнасць Бога ўказвае на яго адсутнасць і наадварот у Бергмана. У вашых карцінах таксама ёсць Бог. У якіх праявах?***

— Для мяне Бог там *(паказвае ўгору)*, што б ні здарылася. Але ён ёсць тут, калі чалавек у гэтай канкрэтнай сітуацыі хоча, каб ён быў. Я дакладна сказаў пра гэта ў фільме «Сербіс» — чалавек не маральны і не амаральны, чалавек — і ёсць мараль. Так і ад самога чалавека залежыць прысутнасць і адсутнасць Бога.

***— Ёсць прадукт кіно, ёсць мастацтва кіно. Што для вас менавіта сапраўднае мастацтва кіно?***

— Для мяне мастацтва праяўляецца яшчэ ў працэсе, то бок стварэнне твора мастацтва і вопыт, які ты атрымліваеш, — і ёсць мастацтва. Фільм аказваецца прадуктам, калі ствараецца дзеля таго, каб проста быць, а мастацтвам, калі ты ўкладваеш у яго тое, праз што табе прыйшлося прайсці, і пражываеш кожны момант свайго твора.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

**ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 04 января 2016 г. в 11.00 состоятся открытые аукционные торги (торги) по продаже имущества, принадлежащего на праве собственности ОАО «Бобруйсктранс» (продавец), в составе:**
<u>Лот № 1</u> **(предмет торгов): Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-42432 (профилакторий для ремонта автомобильных шин), общей площадью 396,1 кв.м, расположенное по адресу: г. Бобруйск, ул. Гоголя, 181**

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509, ОКПО 55484006, 220034, г. Минск, ул. Чапаева, д. 4, к. 222, р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска МФО 153001369 |
| **Продавец предмета торгов** | Открытое акционерное общество «Бобруйсктранс», УНП 700169542, ОКПО 291215757, 213830, г. Бобруйск, ул. Минская, 123/1, р/с 3012420021026 в ОАО «Белинвестбанк» ЦБУ № 831 г. Бобруйск, ул. Пушкина, 198, код 739, р/с 3012259270013 в РКЦ № 24 ОАО «Белагропромбанк» г. Бобруйск, ул. Горького, 1, код 458 |
| **Место проведения торгов и подачи документов** | ул. Чонгарская, д. 54 , г. Бобруйск, в здании Бобруйского управления Филиала «Центр «Белтехинвентаризация» в рабочие дни с 8.30 до 17.30 |
| **Начальная цена продажи и размер задатка** | **880 000 000 рублей с учетом НДС, задаток 10% от начальной цены – 88 000 000 рублей** |
| **Номер расчетного счета для перечисления задатка** | **Получатель платежа –** Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска МФО 153001369, УНП 102353509 |
| **Информация о земельном участке** | Земельный участок с кадастровым номером 741000000007002243 пл. 2,6457 га расположен по адресу: г. Бобруйск, ул. Гоголя, 181. Имущественные права на земельный участок – право постоянного пользования. Земельный участок для обслуживания предмета торгов будет выделен после приобретения объекта с торгов согласно Законодательству Республики Беларусь. |

| | |
|---|---|
| **Характеристика предмета торгов** | Здание профилактория для ремонта автомобильных шин – одноэтажное кирпичное,1980 г.п., фундамент – кирпич.., перекрытия – ж/бет.; кровля – рулонная, полы – бетонные, имеется электроснабжение |
| **Условия продажи предмета торгов** | 1. При заключении договора купли-продажи между продавцом и покупателем (претендентом на покупку) на цену продажи предмета торгов будет начислен НДС по ставке 20%, который необходимо перечислить на р/с ГУ МФ Республики Беларусь по Могилевской области № 3602917010008 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код 795, УНП 700005949, назначение платежа 01001 за ОАО «Бобруйсктранс», УНП 700169542<br>2. Здание реализуется под контролем судебного исполнителя<br>3. Денежные средства, причитающиеся от реализации объектов без учета НДС, перечисляются на счет ОАО «Бобруйсктранс» № 3012259270039 в РКЦ № 24 ОАО «Белагропромбанк» г. Бобруйск, ул. Горького, 1, код 458, УНП 700169542 |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 (Двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов |
| **Сроки и условия оплаты** | Определяются по согласованию победителя торгов (претендента на покупку) с продавцом при заключении договора купли-продажи |
| **Срок подачи документов, осмотра объектов и внесения задатка** | по 29 декабря 2015 г. включительно до 17.00 |

<u>**Для участия в торгах лица, заявившие о своем участии в них, должны предоставить по указанному адресу следующие документы:**</u> заявление на участие в торгах; копию платежного поручения о внесении участником торгов суммы задатка с отметкой банка об исполнении, паспорт; <u>**для резидентов Республики Беларусь:**</u> **юр. лицам** – доверенность представителю юр. лица (в случае необходимости таковой), копии и оригиналы учредительных документов и свидетельства о гос. регистрации; **представителям физ.лиц** – нотариально заверенную доверенность; <u>**для нерезидентов Республики Беларусь:**</u> **юр. лицам** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена не ранее чем за 6 мес. до подачи заявления на участие в торгах) или иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; **юр. лицам и физ. лицам** – документ о состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорус.(рус.) язык; **представителям юр. лиц и физ. лиц** – легализованную в установленном порядке доверенность.

<u>**Порядок проведения торгов:**</u> **Шаг аукциона определяется в размере от 5 до 15 процентов от начальной цены предмета торгов. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. По завершении торгов составляется протокол об итогах проведения торгов, который подписывается победителем и членами аукционной комиссии и является основанием для заключения договора купли-продажи. В случае, если заявка на участие в торгах подана только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.** Задаток, внесенный Победителем торгов будет зачтен в счет оплаты стоимости услуг Организатора торгов, разница между задатком и суммой стоимости услуг будет зачислена в счет окончательной оплаты приобретенного предмета торгов, остальным участникам будет возмещен в течение 5(пяти) рабочих дней со дня проведения торгов. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов в любое время, но не позднее чем за три дня до даты их проведения.

<u>**Победитель (Претендент на покупку)**</u> возмещает затраты и стоимость услуг на организацию и проведение торгов не позднее 3(трех) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов в соответствии с соглашением о правах и обязанностях сторон в размере 3% от начальной цены продажи.

**Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 72 01 32, 72 13 93, 8 (044) 710-50-85 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.**